Источник: **«Звязда» - 2014-01-14**

# Тарашкевічы

**Браніслаў Тарашкевіч — аўтар першай «Беларускай граматыкі для школ»**
**Многія з нас чулі або самі выкарыстоўвалі слова «тарашкевіца». Звычайна гэтым словам называецца адзін з варыянтаў беларускай арфаграфіі, які існаваў да правапіснай рэформы 1933 года. Слова «тарашкевіца» ўтворана ад прозвішча выдатнага грамадскага і палітычнага дзеяча, асветніка, вучонага-мовазнаўцы, пісьменніка, публіцыста і перакладчыка Браніслава Адамавіча Тарашкевіча. Браніслаў Тарашкевіч адносіцца да ліку інтэлігентаў пачатку XX стагоддзя, якія прысвяцілі ўсё сваё жыццё ідэі нацыянальнага адраджэння беларускага народа, яго мовы, гісторыі і культуры.**




Нарадзіўся Тарашкевіч 8 (20) студзеня 1899 года ў засценку Мацюлішкі, недалёка ад Вільні, у сялянскай сям'і. Бацькі не мелі магчымасці вучыць сына, але імкненне юнага Браніслава да ведаў дазволіла яму, адзінаму з усіх дзяцей сям'і, атрымаць адукацыю. Спачатку ён вучыўся ў Віленскай гімназіі, затым на гісторыка-філалагічным факультэце Петраградскага ўніверсітэта, дзе і застаўся працаваць.

У 1918 годзе падрыхтаваў і выдаў у Вільні ў друкарні Марціна Кухты першы падручнік для школьнікаў «Беларуская граматыка для школаў». Граматыка была апублікавана дзвюма графікамі — лацінкай і кірыліцай. Выданне «Беларускай граматыкі» стала сапраўднай падзеяй у гісторыі беларускага мовазнаўства: яно адкрыла новую эпоху ў развіцці беларускай літаратурнай мовы. У кнізе аўтар абагульніў, сістэматызаваў і замацаваў беларускамоўныя пісьмовыя традыцыі, якія склаліся да гэтага часу, улічыў лінгвістычны вопыт папярэднікаў, у першую чаргу сваіх настаўнікаў — А. Шахматава і Я. Карскага. Усё гэта садзейнічала станаўленню нормаў літаратурнай мовы. Прайшло амаль сто гадоў, а правілы, сфармуляваныя Браніславам Тарашкевічам, застаюцца актуальнымі да нашых дзён. Больш за тое, некаторыя публіцыстычныя выданні і асобныя

творцы і сёння карыстаюцца нормамі, адлюстраванымі ў «Беларускай граматыцы для школаў» Браніслава Тарашкевіча.

У 1921–1922 гадах ён працаваў выкладчыкам і дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі ў Мінску. Сотні юных беларусаў мелі шчасце слухаць лекцыі па беларускай мове і літаратуры, якія ім чытаў слынны вучоны. У гэты ж час Тарашкевіч стаў адным з заснавальнікаў Таварыства беларускай школы, якое налічвала больш за 30 тысяч чалавек. Таварыства адыграла выключную ролю ў пашырэнні беларускамоўнай асветы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Таварыства беларускай школы вяло сапраўдную барацьбу з польскімі афіцыйнымі ўладамі за арганізацыю і існаванне беларускіх школ, за дэмакратызацыю адукацыі, арганізацыю нацыянальных выдавецкіх цэнтраў. Натхняльнікам самых розных мерапрыемстваў Таварыства выступаў сам Тарашкевіч.

У гэты ж час гэты аўтарытэтны вучоны і грамадскі дзеяч пачынае актыўна займацца палітыкай. У 1922 годзе ён абраны паслом (дэпутатам) польскага сейма, а ў 1922–1924 гадах з’яўляўся старшынёй Беларускага пасольскага клуба. З трыбуны сейма пастаянна выступаў у абарону сацыяльных і нацыянальных правоў беларусаў на тэрыторыі Польшчы, адстойваў права землякоў на навучанне на роднай мове. У 1925 годзе заснаваў Беларускую сялянска-работніцкую грамаду, а пазней стаў членам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. У 1927 годзе быў асуджаны польскімі ўладамі на 12 гадоў турмы. Падставай для арышту была названа спроба дзяржаўнага перавароту з мэтай далучэння Заходняй Беларусі да Савецкага Саюза.

Знаходзячыся ў зняволенні, Тарашкевіч не пакідаў творчую работу: ён працаваў над падрыхтоўкай гістарычнай граматыкі беларускай мовы, пераклаў на беларускую мову паэмы «Іліяда» Гамэра і «Пан Тадэвуш» Адама Міцкевіча. Падчас зняволення ён быў абраны акадэмікам толькі што створанай у Мінску Беларускай акадэміі навук.

Праз два гады спецыяльным распараджэннем Прэзідэнта Польшчы быў вызвалены. Пазней, у 1931 годзе, Браніслаў Тарашкевіч зноў быў арыштаваны і асуджаны на 8 гадоў катаржнай турмы.

У 1933 годзе ў выніку дамовы паміж Польшчай і СССР адбыўся абмен двума знакавымі палітвязнямі — палітыкам і вучоным, вязнем польскіх астрогаў Браніславам Тарашкевічам і драматургам, акцёрам і рэжысёрам Францішкам Аляхновічам, вязнем савецкага канцлагера. Па сведчанні вядомага даследчыка жыцця і творчасці Браніслава Тарашкевіча прафесара Арсеня Ліса, Мінск вітаў Тарашкевіча як трыумфатара, героя, рэвалюцыянера. Ён атрымаў пасаду намесніка загадчыка польскага аддзела ў Міжнародным аграрным інстытуце ў Маскве. Аднак савецкай уладзе не патрэбны былі адукаваныя інтэлігентныя нацыянальна арыентаваныя людзі. У 1937 годзе ў выніку сталінскіх рэпрэсій фактычна была вынішчана творчая інтэлігенцыя Беларусі. Не абмінуў трагічны лёс і Браніслава Тарашкевіча. 6 мая 1937 года ён быў арыштаваны па справе так званага «Беларускага нацыянальнага цэнтра». 5 студзеня 1938 года выдатны дзеяч беларускага народа Браніслаў Тарашкевіч быў асуджаны «двойкай» (камісіяй НКУС СССР і пракурорам СССР) да найвышэйшай меры пакарання. 29 лістапада 1938 года прысуд быў прыведзены ў выкананне: Браніслаў Тарашкевіч быў расстраляны. Праз 19 гадоў Тарашкевіч быў рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР у сувязі з адсутнасцю складу злачынства.

У Беларусі імя Браніслава Тарашкевіча ўшанавана ў назвах вуліц у горадзе Мінску, Маладзечне і гарадскім пасёлку Радашковічы Маладзечанскага раёна. З 1969 года імя Тарашкевіча носіць ліцэй з беларускай мовай навучання ў польскім горадзе Бельск-Падляскі.

Ігар Капылоў. Тарашкевічы

**Ігар КАПЫЛОЎ.**

**Паходжанне прозвішча і сучасныя Тарашкевічы**

*Прозвішча Тарашкевіч паходзіць ад народнай формы Тараска (варыянт Тарашка), утворанай ад хрысціянскага імя Тарас (у старажытнагрэчаскай мове абазначала «бунтар»). На тэрыторыі сучаснай Беларусі прозвішча Тарашкевіч сустракаецца толькі ў некалькіх рэгіёнах: Полацкі раён (Віцебская вобласць), Астравецкі, Воранаўскі, Іўеўскі, Шчучынскі раёны (Гродзенская вобласць), Дзяржынскі, Пухавіцкі раёны (Мінская вобласць).*